Мірны атам
Стар. 4

Адукацыя
Стар. 6

Сьмешна
Стар. 8

№50
КРАСАВІК 2009

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Вярнуць зямлю селяніну

АПОШНІЯ ГАДЫ ШМАТ ДУМАЎ: А ЯКУЮ НІШУ МАГЛА Б ЗАНЯЦЬ НАША СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА Ў МІЖНАРОДНЫМ ПАДЗЕЛЕ ПРАЦЫ? ДЗЕ МЫ МАГЛІ Б СКЛАСЦІ КАНКУРЭНЦЫЮ З ЕЎРАПЕЙСКІМ І НАВАТ СУСВЕТНЫМ ВЫТВОРЦАМ? НА МОЙ ПОГЛЯД, КАЛІ АДКІНУЦЬ НАША КАЛГАСНАЕ-САЎГАСНАЕ БЯЗГЛУЗДЗЕ, ТО ГЛЕБАВА-КЛІМАТЫЧНЫЯ ЎМОВЫ НАЙБОЛЬШ СПРЫЯЮЦЬ ВЫРОШЧВАННЮ ІЛЬНУ І БУЛЬБЫ. І ВОСЬ, У "НАРОДНАЙ ВОЛІ", АПУБЛІКАВАНЫ АРТЫКУЛ ЦІ ІНТЭРВ'Ю СВЯТЛАНЫ КАЛІНКІНАЙ З БІЗНЕСОЎЦАМ СЯРГЕЕМ ЛЕВІНЫМ: "ПОЧЕМУ ЕВРОПЕЙСКИЕ ЛЬНОВОДЫ ИМЕЮТ РОДОВЫЕ ЗАМКИ, А БЕЛОРУССКИЕ - ОДНИ ДОЛГИ".


ФОТА З АРХІВУ

Хачу сказаць ад сябе, што ў нас у любой галіне сельскай гаспадаркі, апроч даўгоў нічога няма. Але вернемся да напісанага. З цікавасцю прачытаў раз і ўзрадаваўся: вось ёсць жа людзі, гатовыя ўкласці свае сродкі на карысць Радзімы, на яе аўтарытэт. Чытаю уважліва. Другі, трэці раз і пачынаю разумець: не ўсё так адназначна.

Давайце паразважаем, чаму лён, які беларусы вырошчвалі з даўніх часоў і прадавалі ў Еўропу, і складалі канкурэнцыю тамтэйшым вытворцам, апынуўся ў такім заняпадзе? На гэты конт я мог бы напісаць цэлую кнігу, але скажу коратка:

у заняпадзе апынулася ўся сельская гаспадарка, таму што быў знішчаны гаспадар.

Для чыноўнікаў і партфункцыянераў стала галоўнай задачай выканаць план па валу. Ці здольныя яго перапрацаваць, а потым прадаць, гэта не абмяркоўвалася. А за рызыку прыняцця ўласнага рашэння можна было паплаціцца не толькі пасадай, але і трапіць за краты.

Працяг на стар.2

№50 КРАСАВІК 2009 Выбар

Пачатак на стар.1

Дарэчы, як і ў наш час – нічога ж не змянілася. Нават той жа прэм'ер Сідорскі кажа, што шукайце сабе нішу, дзе не будзе канкурэнцыі дзяржаве. Бачыце, як нашы ўлады баяцца канкурэнцыі. Там жа не дурні, яны добра ведаюць, што

канкурэнцыя ў вытворчасці непазбежна прывядзе да канкурэнцыі ў палітыцы.

А ім гэта трэба? Дык чаму вы лічыце, што нічога не памяняўшы ў вытворчых адносінах, не стварыўшы канкурэнтных умоваў дома, можна зрабіць што-небудзь слушнае, тым болей выйсці на Еўрапейскі ці нават сусветны ўзровень?

Усё ж лен не піва, галоўны капітал тут зямля. Калі ўзяць па тэхналогіі і сеяць праз сем год, то на кожную тысячу га ільну трэба яшчэ шэсць тысяч га зямлі. І калі пад шумок прыдбаеце "на капейку" спісанага абсталявання і падкінеце "барашка в бумажке", то зямлі можна атрымаць "на рубель". Але пры чым тут лён? Меўшы на 1 га ільну 7 га ворнай зямлі, можна лён ужо зусім і ня сеяць (нагоды знойдуцца). Гэтыя высновы я зрабіў з Вашага ж патрабавання: "спачатку зямля і ўжо потым ільнозаводы". Прычым зямля на калгасных умовах (лічы за дарма). Вось дзе "сабака зарыты". Лічым: шэсць ільнозаводаў, мінімум па паўтары тыс. га ільну на адзін завод, па вашай тэхналогіі: 1,5 множым на 7 атрымаецца 10,5 тыс. га., гэта на адзін завод, значыць больш за 60 тысяч га ворнай зямлі ўсяго, пры тым лепшай (лён на пясочках не пасееш).

Канешне, тут спадчына вашым дзецям будзе добрая. А якая спадчына застанецца нашчадкам тых, у каго гэтую зямлю забралі гвалтам у тыя ж калгасы?

І калі зямля яшчэ ні чыя, то ёсць хоць і слабая надзея, што яе вернуць, але калі трапіць у Вашы рукі, то гэта ўжо на вечна. І не слухайце калі Лукашэнка крычыць "Да кому она нужна эта земля, кто её возмёт?". Па-першае: яе яшчэ нікому не давалі. Па-другое, зямлю адарвуць з рукамі, калі на ёй можна будзе працаваць на сябе. Далей: "вот я был в Сербии, у них все-таки уровень земледелия высочайший, они нам завидуют, что

# Вярнуць зямлю селяніну



у нас по пять, по сем по 10 тысяч гектаров куски земли". Запытаю: "хто зайздросціць?". Іхні фермер (які мае хоць і не шмат гектараў, але ўласных) нашаму жабраку-селяніну, які жыве ў дзесяцітысячным калгасе фактычна нічога свайго не маючы? Чыноўнікі, буйны бізнес – так, зайздросцяць, бо не маюць права распараджацца чужой уласнасцю, як ім хочацца. І зноў там жа Лукашэнка: "зачем же нам делить, резать и раздавать?".

Сапраўды працей аддаць разам 10 тысяч га. А сяляне? А што з іх возьмеш, цярпелі і пацерпяць, яны ж свае.

Спачатку павінны вярнуць зямлю тым, хто на ёй працуе, і ўжо яго права, што з ёю рабіць, альбо прадаць Вам, ці здаць у арэнду, ці за акцыі, ці самому вырошчваць лён, гэта ўжо хто на што здатны.

Напрыканцы маёй працы старшынёй калгаса ў калгасе "Дрыбінскі" на аднаго працаўніка прыходзілася больш за 10 га ворыва, нават калі разам з пенсіянерамі, будзе ўдвая менш, то пры кошце зямлі ва Усходняй Еўропе ад 1 да 2 тысяч даляраў, колькі б гэта было дадаткова да мізэрных калгасных заробкаў?

Так што спачатку трэба правесці зямельную рэформу, яна закладзе трывалы падмурак і пад бізнес. Дармавая зямля, не прынесла шчасця калгасам, не прынясе яго і Вам, Сяргей.

Прыватная ўласнасць павінна ствараца паводле закону, і законам павінна быць абароненая. Мне давялося пасля пенсіі папрацаваць у Расіі, і я бачыў адносіны да зямлі і сялян і бізнесоўцаў. (у нас адны праблемы: і там, і тут за Савецкія часы быў вынішчаны гаспадар).

Крыўдна было глядзець, калі 8 га метровага чарназёму ішлі за 500-600 даляраў.

Былі сярод тых, хто прадаваў, і збяднелыя пенсіянеры, былі і п'яніцы,

але ж былі і такія, хто не пад якім выглядам не прадаваў за гэтыя грошы, а здаваў у арэнду, ці каму ў карыстанне, ці пакідаў дзецям застаючыся ўласнікам.

І такіх было болей.

Зямельнае пытанне, вельмі складанае пытанне. Несправядлівае яго вырашэнне закладзе міну пад будучую стабільнасць дзяржавы.

У адным згодзен з Вамі, што наша ўлада, разумнейшая за французскую, таму што ўратавала лёгкую прамысловасць.

Але "Почему европейские льноводы имеют родовые замки, а белорусские одни долги?"

*Мікалай Юркоў*




# І зноў пра заробкі

Чытачы "Паходні" у апошні час пастаянна цікавяцца ў мяне, у якую з арганізацый нашага Бялыніцкага раёна лепш за ўсё уладкавацца на працу, дзе ёсць магчымасць зарабіць добрую капейку. Для любога журналіста жаданне чытача – гэта закон, таму пастараюся крыху распавесці, хто ў Бялыніцкім раёне зарабляе параўнальна добра і ў якіх арганізацыях зарабатнай платы хопіць толькі на хлеб.

Адразу хачу папярэдзіць паважаных чытачоў, што не змагу назваць лічбу сярэдняга заробка ў некаторых арганізацыях, праца ў якіх лічыцца ў нашым раёне прэстыжнай. Канешне,пэўныя лічбы па канкрэтных асобах я ведаю, але лічбы сярэдняга заробку ў такіх аўтарытэтных арганізацыях як Бялыніцкі РАУС, аддзел па надзвычайных сітуацыях, райвыканкам, ужо некалькі гадоў як перасталі з'яўляцца ў статыстычных справаздачах не толькі ў нашым раёне, а і па краіне ў цэлым. У прыватнасці, заробак працаўнікоў сферы дзяржаўнага кіравання знік са статыстычных сайтаў ужо амаль два гады таму, калі, пры сярэднім паказчыку заробку па краіне каля 600 тысяч рублёў у прадстаўнікоў кіруючай сферы ён перавысіў мільён рублёў.

З тых жа арганізацый, што ёсць у справаздачах нашых статыстыкаў, найбольш добры заробак мелі работнікі РУП "Магілёўскае агенства па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру" (1437,5 тыс. рублёў), аддзялення ААТ "Белаграпрамбанк" у г.п. Бялынічы (1304,7 тыс. рублёў), Бялыніцкага раёна газазабеспячэння (1210,9 тыс. рублёў), Бялыніцкая ПМК-241 (1063,6 тыс. рублёў). У сельскай мясцовасці маглі атрымаць нядрэнныя грошы працаўнікі Вішоўскага ААТ "ПМК-83 водбуд", дзе сярэдні заробак склаў 871 тысячу рублёў і ААТ "Новая Друць" (806,2 тыс. руб.). Трэба адзначыць, што мяне крыху здзівіла, як сярэдні заробак у "Новай Друці" змог атрымацца настолькі нашмат большым, чым сярэдні заробак у сапраўднага шматгадовага лідэра сельскагаспадарчай вытворчасці нашага раёна – СВК "Калгас "Радзіма".У мінулым годзе працаўнікі СВК атрымлівалі ў месяц у сярэднім 689,6 тысячы рублёў.

Сярод галін народнай гаспадаркі Бялыніцкага раёна найбольш высокі ўзровень заработнай платы за 2008 год склаўся ў будаўніцтве (985,8 тыс. рублёў), на транспарце (805,9 тыс. рублёў) і ў лясной гаспадарцы (772,8 тыс. рублёў).

Як звычайна, найменш атрымлівалі працаўнікі сельскагаспадарчай галіны (546,3 тыс. руб.) і работнікі сацыяльнага забеспячэння (510.1 тыс. руб. у сярэднім па Магілёўскай вобласці).

Сярэднемесячная зарплата работнікаў галін эканомікі нашага раёна ў 2008 годзе склала 687,1 тысячы рублёў і павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 23,6 працэнта. Здаецца, нядрэнныя грошы, але, як кажуць, усё пазнаецца ў параўнанні. Таму прывяду для паважаных чытачоў яшчэ дзве лічбы:

Сярэдні памер налічанага намінальнага заробку ў Беларусі ў 2008 годзе складаў больш за 885 тысяч рублёў за месяц.

У Магілёўскай вобласці намінальны налічаны заробак заробак быў амаль на 100 тысяч меншы, чым у сярэднім па краіне – 795 тысяч рублёў.

Як бачым, паказчыкі аплаты працы ў нашым Бялыніцкім раёне значна адстаюць ад сярэдніх заробкаў па Магілёўскай вобласці і па краіне ў цэлым.

Напрыканцы крыху астановімся на тых арганізацыях, у якіх людзі за сваю працу атрымліваюць літаральна капейкі. Цяжка нават уявіць, як за такія заробкі карміць і апранаць дзяцей, ўтрымліваць сям'ю. Значна ніжэй сярэднераённай заработная плата ў мінулым годзе склалася ва УКП "Бытпаслугі" (333,5 тыс. рублёў), УКСП "Саўгас "Іскра" (275,5 тыс. рублёў), СВК "Калгас імя Заслонава" (352,8 тыс. рублёў), СВК "Ількавічы" (389,8 тыс. рублёў), УКСП "Саўгас "Падзевічы" (355,3 тыс. рублёў), СВК "Лебядзянка" (378,9 тыс. рублёў), Бялыніцкі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў (439,6 тыс. рублёў). Для прыкладу, нават сярэднемесячны памер пенсіі па ўзросту ў Бялыніцкім раёне ў 2008 годзе (365,8 тыс. руб.) перавышае заробак у шэрагу вышэйназваных прадпрыемстваў. Я ўжо не кажу пра пенсіі былых працаўнікоў сілавых ведамств.

Таксама адзначу шаноўным чытачам "Паходні", што згодна афіцыйных дадзеных аблстату, заробкі амаль ва усіх галінах народнай гаспадаркі Магілёўскай вобласці ў студзені-лютым 2009 г. значна зменшылісь у параўнанні з снежнем 2008 г. А калі яшчэ ўспомніць, на колькі за гэты час падрос курс долара адносна беларускага рубля і якая ў нас інфляцыя ў першым квартале, становіцца зусім сумна…

Тым больш, што уладкавацца на большменш прыстойную працу ў Бялыніцкім раёне становіцца ўсё складаней. Паўсюдна людзі скардзяцца на зніжэнне заробкаў, шмат каго з працаўнікоў адпраўляюць у адпачынак за свой кошт. Патрабуюцца на працу людзі ў шэраг сельскагаспадарчых арганізацый нашага раёна, але вы самі бачыце, паважаныя чытачы, якія там заробкі.

***Барыс Вырвіч***

№50 КРАСАВІК 2009 Выбар

# Чарнобыльскі тыдзень у Горках

У Горках пачаліся мерапрыемствы Чарнобыльскага тыдню, які быў абвешчаны мясцовай Кааліцыяй дэмакратычных сілаў.

Першай акцыяй стала пасадка дрэваў, якую правялі жыхары вуліцы Першамайскай, што на ўскрайку горада. У першы дзень уздоўж вуліцы і на суседняй пустэчы было пасаджана каля ста маладых бярозак. У выніку ўдзельнікі акцыі вырашылі, што працягнуць яе на наступным дні, бо вольнае месца для азеляненьня вуліцы яшчэ засталося.





# Правда о Чернобыле

Фильм, который не так давно был показан по каналу «Дискавери» стал поводом для коллективного просмотра, организованного на частной квартире в Горках участниками Горецкой антиядерной группы. Наполовину игровая, наполовину документальная лента протяженностью около 40 минут рассказывает о нескольких часах до и после катастрофы, произошедшей на Чернобыльской АЭС.

«Самая безопасная и современная (на то время) станция» в результате ошибок при проектировании и эксплуатации превратилась в огромную атомную бомбу, унесшую и искалечившую жизни тысяч людей. Фильм заставляет задуматься: а где гарантия, что пресловутый «человеческий фактор» не сработает снова на одной из еще более «безопасных» и «современных» АЭС, коих так много понатыкали беспечные и безответственные ученые и политики по всему свету.

Как сказал кто-то из классиков: «Самое страшное в том, что судьба человечества находится в руках людей».

Тем, кто еще не видел этот фильм и хотел бы получить его копию, предлагаем обращаться по тел. 545 89 83, или 623 61 08

Иван МОРОЗОВ

# Девальвированный Чернобыль

Про аварию на Чернобыльской АЭС у нас не забыли. Вспоминают о чернобыльской трагедии каждый год. Но лучше бы не вспоминали вообще, чем таким образом. Из трагедии миллионов людей сделали трафаретное мероприятие для галочки. Мало того, в этот памятный день устраивают танцы, поют весёленькие песни. Настоящее шоу на гробах чернобыльцев.

Всё это называется благотворительный творческий марафон «Чернобыльский шлях — дорога жизни». Скажи кому-нибудь «Шлях в Хатынь — дорога жизни», так в ответ назовут дураком. И правильно сделают, ибо кощунства не прощают. Почему же словосочетание «чернобыльская дорога жизни» не режет ухо, не дёргает совесть?

Марафон ежегодно проводят в районах, пострадавших от аварии на ЧАЭС. В прошлом году Климовичи навестили артисты с «лирическими и шуточными танцевальными композициями» (из репортажа в районной газете). Зрители слушали исполнителей, «принимали приглашение потанцевать с ними». Приезжала и некая «экстравагантная Анастасия, солистка шоу-группы». В этом году хождение по дороге жизни продолжено, объявления о предстоящих концертах висят.

Думаете, станцуете и Чернобыль исчезнет? В Климовичском районе в минувшем году стало меньше на 500 человек. Никуда за это время радиация не ушла, только наше здоровье уходит. Когда просачиваются отдельные сведения об истинном положении дел, то волосы дыбом становятся. На Гомельщине, наиболее пострадавшей от радиоактивных выбросов, начиная с 2000 года количество детей, рождающихся с патологиями, возросло на 175 процентов. Всего пятая часть родов проходит здесь нормально, без каких-либо осложнений. Эти с рождения больные младенцы — заложники Чернобыля и нашего отношения к нему.

Господин Кодатенко, глава Чериковской райисполкома, сказал как-то в интервью: «Вообще же, если всё время плакаться, что Чериковщина является районом, пострадавшим от аварии на Чернобыльской АЭС, то получается, что и работать уже не надо? Мы про это не думаем и не говорим, а развиваемся как и районы республики, не подвергшиеся воздействию атомной катастрофы». Вот именно, не думаем и не говорим, не говорим и не думаем…

*Сергей Аржанцев*

# Простимулировали увеличением отработки

На селе давно и хронически не хватает рабочих рук. Когда говорят, что на фермах и полях некому работать, это не преувеличение, а горькая правда нашего времени. Но особенно чувствуется острая нехватка руководящих кадров и самых различных специалистов. Насыщение сельхозорганизаций и хозяйств выпускниками не снижает остроту проблемы. Молодёжь, отбыв двухлетнее распределение, уезжает куда угодно в поисках лучшей доли. На месте остаются совсем немногие, примерно 10-12% от общего количества распределенных.

Причины, объясняющие массовый отъезд молодых специалистов, всем хорошо известны. Невысокая зарплата, отсутствие нормальных жилищных условий, ненормированный рабочий день. Тут и два года покажутся вечностью. Стоит ли удивляться, что в хозяйствах сплошь и рядом работают свежеиспеченные специалисты. Распределение этого года в Климовичском аграрном колледже подтверждает данную тенденцию. Из 186 выпускников в Климовичах оставили только 30 человек. Остальных направили закрывать кадровые «дыры».

Как же изменить сложившееся положение? Предложений много, но власть действует своими излюбленными методами. Например, Геннадий Лавренков, помощник президента и главный инспектор по Могилевской области, здраво рассуждает о том, что нужно создавать условия, чтобы заинтересовать молодежь оставаться на селе. Такие взгляды заслуживают всяческой похвалы, но тут же выясняется, что одним из путей закрепления чиновник считает увеличение сроков обязательной отработки. Называется, создали условия… И это не частное мнение, так как в то же самое время появляется постановление Правительства (№ 8 от 2009 года), в котором утвержден комплекс мер по закреплению квалифицированных кадров в сельском хозяйстве. Постановление предусматривает увеличить сроки отработки для молодых специалистов с высшим образованием до 5 лет, средним специальным — до 3 лет.

Что тут скажешь, стимул по-белорусски — самый действенный и безотказный. Отрабатывали два года, отработают и пять, никуда не денутся. Только не приведёт ли такое принудительное заинтересовывание молодёжи к тому, что молодые люди начнут обходить аграрные вузы и училища далеко стороной? Впрочем, старики помнят, как в советское время колхозникам просто не выдавали паспорта, чтобы не поуезжали в город. Так что те, кто разрабатывает и утверждает подобные «стимулирующие» постановления, задействовали ещё не все возможные способы удержания людей в деревне.

*Игорь Бычков*

# Магілёўскія школьнікі пачнуць вучыцца па-беларуску

Вучні беларускамоўных клясаў школы № 3 г. Горкі карыстаюцца падтрымкаю сяброў Таварыства Беларускае мовы



Упершыню за пятнаццаць гадоў у Магілёве можа зьявіцца беларускамоўная кляса.

Пра намер адкрыць яе заявілі ў аддзеле адукацыі Ленінскага раёну абласнога цэнтру. Чыноўнікі запэўніваюць, што гатовыя вучыць па-беларуску нават адно дзіця. Паводле іх, у школах гораду ўжо пачалося інфармаваньне бацькоў пра набор у клясу.

Ініцыявалі адкрыцьцё беларускамоўнай клясы ў Магілёве муж і жонка Бацюковы. Іх сын Мікола больш за два гады наведвае адзіную ў Магілёве беларускамоўную групу дзіцячага садка № 81.

“Ведаючы, што з бухты-барахты ў нас хутка ня робіцца, я напісаў заяву з просьбай прыняць Колю ў беларускамоўную клясу. Мне праз месяц прыйшоў адказ, што, маўляў, без праблемаў будзе фармавацца такая кляса на базе восьмай школы. Цяпер абмяркоўваецца пытаньне камплектацыі гэтай школы — што за дзеці туды будуць хадзіць, чакаюцца заявы ад іншых бацькоў”, — кажа Аляксей Бацюкоў.

Заява Бацюковых пакуль адзіная ў аддзеле адукацыі.

“Мы распаўсюдзілі паведамленьне па ўсіх школах для таго, каб вывучыць запыты бацькоў па гэтым пытаньні. Чакаем водгукаў ад бацькоў. Адміністрацыі школ праводзяць гэтую працу. На бацькоўскіх сходах мы будзем пра гэта гаварыць і будзем набіраць такую клясу. Але ў любым выпадку, нават калі не набяром, для аднаго дзіцяці мы будзем шукаць магчымасьці для адкрыцьця клясы”, — зазначае намесьніца начальніка аддзелу адукацыі Людміла Кавалёва.

На пачатку дзевяностых у восьмай школе ўжо былі беларускамоўныя клясы. У 1994 годзе іх зачынілі, нібыта згодна з патрабаваньнямі бацькоў. У адміністрацыі, аднак, пра тыя клясы ня памятаюць.

“Напэўна, спроба такая была. Калісьці ж гэтыя клясы ўжо ўваходзілі ў моду. Таму нездарма, я думаю, аддзел адукацыі спыніўся на нас. Мы праводзім бацькоўскі сход для першаклясьнікаў, і завуч выходзіць з прапановай да бацькоў. Хто выкажа жаданьне — калі ласка. Калі гэта будзе адно-два дзіцяці, усё адно кляса будзе функцыянаваць”, — запэўнівае дырэктарка школы № 8.

Восьмая школа знаходзіцца ўдалечыні ад бальшыні магілёўскіх раёнаў. Гэта можа стаць праблемай для фармаваньня клясы, лічыць адзін з ініцыятараў стварэньня ў Магілёве беларускамоўнай групы ў дзіцячым садку Зьміцер Салаўёў:

“Кляса — гэта ня тое, што садок. Калі ў садок заводзіш дзіця на цэлы дзень, то ў пачатковых клясах сканчаюцца заняткі недзе ў абед. Проста фізычнай магчымасьці ў бацькоў, якія жывуць далёка, забіраць дзяцей ня будзе. Магчыма тут як выйсьце адкрыцьцё дзьвюх-трох клясаў па горадзе”.

Паводле суразмоўцы, беларускамоўная грамада ў Магілёве прыкладзе максымум намаганьняў, каб у адзіным беларускамоўным клясе вучылася як мага больш дзяцей.

Сярод гарадоў Магілёўшчыны толькі ў Горках на сёньня ёсьць беларускамоўныя клясы. Іх дзьве. У чацьвёртай горацкай школе ў адзінаццатай клясе вучацца чацьвёра вучняў, а ў трэцяй — пяцёра. Клясы адчынілі на патрабаваньне сям’і Каральковых.

Што да адзінай беларускамоўнай групы “Вясёлка” ў дзіцячым садку, якую адчынілі ў Магілёве ў сьнежні 2007 году, то яе на сёньня наведваюць шасьцёра дзетак.

# Под Бобруйском посадили лес для партизан

Город над Березиной "зашкаливает" от идеологических мероприятий под знаком военной тематики. От этого чрезмерного усердия даже детям стало не до войны.

На бывшем военном полигоне в Дубовке в честь 65-летия освобождения Беларуси высажено 13 гектаров сосен. Напоминать потомкам об этом будет специальный знак.

Подобные акции в рамках Дня леса стали уже традиционными. Однако до этого года никому в голову не приходило связывать появление новых лесов в Беларуси с освобождением ее от фашистов.

Вообще не посвятить что-то теме войны в этом году стало просто неприлично.

К примеру, недавно в Бобруйске прошел молодежный танцевальный конкурс "под музыку военных лет".

А детишки из детского сада "Гармония", одного из наиболее продвинутых в городе, подготовили к 8 марта театрализованное представление. Под названием "Вклад женщины в Великую Отечественную войну". Маршировали малыши в специально сшитой военной форме и с муляжами автоматов в руках.

На прошлой неделе о проделанном за год отчитывался Центр внешкольной работы "Росквіт". Состоялся двухчасовой концерт танцевальных и вокальных кружков. В течение первого часа замечательные детские коллективы просто соревновались друг с другом, кто же исполнит "наиболее военное".

– Я купила билет на отчетный концерт "Росквіта" – в газете было объявление, – недоумевает пенсионерка Валентина Мефодьевна. – Но впечатление сложилось такое, что дети за войну отчитывались! Аж голова разболелась.

Конечно, тематику номеров ребята выбирают не сами. Педагоги же – как люди государственные – обязаны следовать идеологии. А согласно установкам сверху, войну недостаточно помнить. Ее нужно еще массово "опеть и оплясать".

В жизни беспрерывная череда песен и плясок "про войну" утомляет, и планируемого воспитательного эффекта не получается.

На концерте "Росквіта" самые горячие аплодисменты сорвали простенький танец "Веселые овечки" и незамысловатая, не несущая никакой идейной нагрузки, песенка про девочку-подростка, зависшую в Интернете.

Алексей, участник посадки леса в Дубовке, иронизирует:

– Я уже несколько лет участвую в лесопосадках. Не в честь каких-то памятных дат. Просто потому, что лес – это красиво. Если посадка сосен – всего лишь мероприятие на военную тематику, тогда в том сосновом бору и партизаны скоро заведутся.

*Надежда ЛИСОВСКАЯ.Regionby.org*

# В Беларуси выявлено пять банд автоугонщиков

На пресс-конференции 16 апреля в Минске начальник отдела главного управления уголовного розыска МВД Виктор Юзефович сообщил, что в Бобруйске (Могилевская область) и Гродно пресечена деятельность двух организованных преступных групп, занимавшихся в том числе угонами автотранспорта. Об этом пишет БелаПАН.

По его словам, в бобруйской группе было пять человек. Они подозреваются в совершении более 20 преступлений, среди которых кражи автотранспорта, кражи из дач, разбой, мошенничество. Участникам гродненской группы вменяется хищение четырех автомобилей "Ауди А6", однако, как отметил представитель МВД, таких преступлений может быть больше.

Всего, по информации В.Юзефовича, с начала года в Беларуси задержано пять групп автомобильных воров, совершивших 21 хищение автотранспорта.

За этот период в стране совершено 107 краж и 244 угона машин. Раскрыто — 54 и 189 соответственно. Наибольшей популярностью у преступников пользуются автомобили "ВАЗ", "Фольксваген", "Ауди", "Москвич" и "Опель".

По словам В.Юзефовича, данные преступления органы внутренних дел разделяют на два вида: совершенные организованными преступными группами, которые извлекают из своего бизнеса преступный доход, и "пьяные" преступления, когда человек посягает на чужую собственность без цели наживы.

Ежедневно в стране похищается или угоняется четыре автомашины. Доля таких преступлений в общем массиве преступности не превышает 1%, однако их опасность высока, поскольку причиняет потерпевшим значительный материальный и моральный ущерб.

Средний "возраст" похищаемых автомобилей — 10—15 лет. Эти транспортные средства в основном разукомплектовывают и реализуют по частям. Есть также факты кражи новых и престижных моделей для последующей их легализации за пределами Беларуси, в основном на территории России.

Как отмечают в МВД, преступники постоянно ищут новые способы перемещения похищенных автомобилей через Беларусь. Помимо перегона с использованием поддельных документов по автомобильным дорогам в 2007 году был зафиксирован случай перевозки краденых автомобилей железнодорожным транспортом.

*Вячеслав БУДКЕВИЧ*

№50 КРАСАВІК 2009 Выбар

## УВАГА: КОНКУРС!

АКТЫВІСТЫ АНТЫЯДЗЕРНАГА РУХУ БЯЛЫНІЦКАГА РАЁНА, ГРАМАДСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА "КРОК," АБ'ЯЎЛЯЮЦЬ АБ ПРАВЯДЗЕННІ КОНКУРСА ДЗІЦЯЧАГА МАЛЮНКА "ДЗЕЦІ БЕЛАРУСІ – ЗА БЕЗ'ЯДЗЕРНУЮ БУДУЧЫНЮ", УДЗЕЛ У ЯКІМ МОГУЦЬ ПРЫНЯЦЬ УСЕ НАВУЧЭНЦЫ ШКОЛ І ВЫХАВАНЦЫ ДЗІЦЯЧЫХ САДКОЎ БЯЛЫНІЦКАГА РАЁНА. РАБОТЫ НА КОНКУРС МОЖНА ПРАДАСТАЎЛЯЦЬ ПА АДРАСЕ: Г. П. БЯЛЫНІЧЫ, ДОМ БЫТА (1 ПАВЕРХ), КРАМА "РУБОН" (ЗВЯРТАЦЦА ДА АЛЕГА МЯЦЕЛІЦЫ, КАНТАКТНЫ ТЭЛ. 8-0296-203210) НА ПРАЦЯГУ КРАСАВІКА І ТРАЎНЯ 2009Г. ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСА БУДУЦЬ УЗНАГАРОДЖАНЫ КАШТОЎНЫМІ ПАДАРУНКАМІ.

СЬМЕШНА

# АПАЗІЦЫЯ "ІДЗЕ Ў НАРОД"

Урад не слухае, народ не ведае. Каб ратаваць краіну ад эканамічнай катастрофы, Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы патрабуюць ад уладаў кардынальных рэформаў. Урад прапановы апазіцыі ігнаруе. Не могуць дэмакраты дагрукацца і да грамадзянаў. Жлобінская дзяржаўная газета "Новы дзень" адмовілася надрукаваць тэкст Антыкрызіснай платформы.

Беларуская апазіцыя мае свой рэцэпт ад крызісу. Антыкрызісная платформа ад Аб'яднаных дэмакратаў паўстала месяц таму. Сёння апазіцыя прызнае, што пра яе праграму пакуль мала хто ведае, бо надрукавалі тэкст Платформы толькі некалькі незалежных выданняў.

АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА, СУСТАРШЫНЯ АБ'ЯДНАНЫХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛАЎ:

"Недзе 700 тысячаў чалавек маглі азнаёміцца з прапановамі апазіцыі. Гэтага недастаткова, таму другі этап – гэта ўлёткавая кампанія. Будзем рыхтаваць улёткі, спецвыпускі газетаў, брашуры – недзе накладам 500 тысячаў экзэмпляраў".

Калі кожную ўлётку прачытаюць хаця б два чалавекі, то паўмільённага накладу хопіць, каб паінфармаваць аб Платформе кожнага дзесятага жыхара Беларусі. Вось толькі не кожны беларус верыць у тое, што апазіцыя можа прапанаваць штосьці сапраўды вартае.

МІНАКІ:

"Да гэтай апазіцыі няма чаго прыслухоўвацца. Бо там усе зладзюгі, там усе варугі і ўсё такое".

"У нас беларуская апазіцыя – гэта "Ленін у разліве". Яе ніколі не было, няма і не будзе. Гэта толькі адныя словы".

"Апазіцыя ў нас занадта слабая. Калі яна і паднімецца ў нас, то гэта яшчэ не хутка будзе".

Гэтым разам апазіцыя мае канкрэтны сцэнар выхаду з крызісу. У першую чаргу, варта скараціць дзяржаўны бюракратычны апарат, увесці прэферэнцыі для малога і сярэдняга бізнесу, знізіць падаткі.

АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА, СУСТАРШЫНЯ АБ'ЯДНАНЫХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛАЎ:

"Самае галоўнае – змяніць эканамічную мадэль. Не "падфарбаваць" яе, не падрэтушаваць, а менавіта новая эканамічная мадэль. Гэта самае галоўнае".

Давесці народу вартасць Антыкрызіснай платформы пакуль не ўдалося. Таму гэтым разам апазіцыя паспрабуе данесці ідэі рэфармавання да ўладаў – з адмысловым спавешчаннем на паседжанні Грамадска-кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта выступіць эканаміст Станіслаў Багданкевіч.

***Зміцер Ягораў, "Аб'ектыў"***

№50 КРАСАВІК 2009 Выбар

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.